# Сімволіка школы

**Герб школы** ўяўляе сабой круг, сімвал дабра і справядлівасці, сімвал бясконцасці ў старажытных славян, контуры якога абазначаны каляровай лініяй. Гэта колеры сцяга школы. У верхняй частцы круга – выява сонца, якое сімвалізуе светлае і бесклапотнае дзяцінства, надзею на росквіт жыцця, надзею на мір і спакой.У ніжняй частцы герба выявы жытніх каласоў, васількоў, папараці, разгорнутай кнігі, накладзеных на малюнак вышытага ручніка. Жытнія каласы разам з сінімі васількамі сімвалізуюць сабой жыццё, стваральную працу, цесную сувязь школы з жыццём і працай хлебароба, папараць – надзею на шчаслівую будучыню. Вышыты ручнік - сімвал доўгайжыццёвай дарогі, якая пачынаецца са школы, з вучобы.

**Сцяг школы** ўяўляе сабой палотнішча прамавугольнай формы, якое складаецца з трох трохвугольных частак: ніжняй – зялёнага колеру, сярэдняй – блакітнага колеру і верхняй – жоўтага колеру. Тры колеры сцяга сімвалізуюць сабой моцную сувязьтрох узроставых груп школьнікаў.

Зялёны колер, колер веснавога адраджэння прыроды, колер жыцця, колер росту, сімвалізуе сабой школьнікаў1-4 класаў, якія ідуць на змену школьнікам старэйшых класаў. Гэта нашчадкіўсіх лепшых традыцый школы. Блакітны колер, колер бясконцасці, палёту мараў, творчасці атаясамліваецца ў сцягу са школьнікамі 5-8 класаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у справах школы, раёна.

Жоўты колер – колер сонца, колер надзей на шчаслівае жыццё, сімвалізуе ўзроставую групу школьнікаў 9-11 класаў. Яны хутка выходзяць у самастойнае жыццё, ад іх будзе залежыць росквіт роднай Беларусі.

ДУА "Елкаўская сярэдняя школа"

